личностный характер. Субъективность выражается также инверсией, использованием парцеллированных, сегментированных конструкций, повторов и др. приемов выразительности.

На **семантико-стилистическом уровне** следует отметить, что разные типы речи (включая функциональные стили) характеризуются разной степенью субъективности. В результате мы имеем все функционально-стилевые разновидности языковых подсистем, которые предназначены для передачи как объективной информации (научный и официально-деловой стили), так и субъективной и экспрессивной информации (разговорный, художественный, публицистический стили) [1].

**Заключение.** Таким образом, лексические, морфологические и словообразовательные средства в тексте выражают оценку эксплицитно и самостоятельно, а фонетические и синтаксические средства являются для них вспомогательными. В письменной речи можно выделить ещё один способ выражения оценки – графический. К его средствам относятся различные шрифты и начертания, знаки пунктуации, повторение графем и др. – все, что позволяет выделить часть текста, привлечь к ней внимание читающего, отразить состояние субъекта речи.

Мы пришли к выводу, что формы и способы выражения субъективной оценки намного разнообразнее, чем принято описывать в лингвистической литературе. В живой разговорной речи они находятся в постоянном взаимодействии между собой, обуславливая единое семантическое пространство речевого высказывания.

1. Краснова, Т.И. Субъективность – Модальность (материалы активной грамматики) / Т.И. Краснова. – СПб.: Изд-во СПбГУЭФ, 2002. – 189 с.
2. Гуревич, В.В. О «субъективном» компоненте языковой семантики / В.В. Гуревич. – М.: Вопросы языкознания, 1998. – № 1. – С. 25-30.

## АСЭНСАВАННЕ ВОБРАЗАЎ-СІМВАЛАЎ У ТВОРАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

***Андрон С.С.,***
*навучэнка 4 курса Полацкага каледжа ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Полацк, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Лабёнак І.Г.*

Стварэнню загадкі ў творы спрыяе наяўнасць мастацкай сімволікі. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў М.А. Лазарука дае наступнае азначэнне сімвалу: “Сімвал – прыём мастацкага паказу, а таксама адзін з тропаў, умоўнае абазначэнне з’явы праз вобраз, які нечым нагадвае гэту з’яву. Сімвалічны вобраз толькі часткова прыпадабняецца з’яве, якую выяўляе, толькі намякае і можа мець розныя тлумачэнні. Асэнсаванне вобразаў – сімвалаў – работа розуму, якая патрабуе ўстанаўлення асцыятыўных сувязей, развіцця мысліцельных працэсаў, праяўлення фантазіі. Вобразы-сімвалы ў творах Уладзіміра Караткевіча – арыенціры, маякі для лепшага эмацыянальнага ўспрымання чытачамі твора, фарміравання літаратурнай свядомасці, пашырэння кругагляду, выхавання патрыятызму, што з’яўляецца актуальным для прафесійнага станаўлення будучага настаўніка пачатковай школы.

Мэта даследавання – параўнаць асэнсаванне ўмоўных знакаў у некаторых творах Караткевіча даследчыкамі яго творчасці і чытачамі-навучэнцамі

**Матэрыял и метады.** Матэрял даследавання – празаичныя творы Уладзіміра Караткевіча. У якасці метадаў даследавання выбраны: метад аналізу, абагульнення, апісання і анкетавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Крытык Анатоль Верабей у нарысе жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча “Абуджаная памяць” ключом да разумення творчасці пісьменніка, яго эстэтычнай праграмы і мастацкіх схільнасцей называе шэсць вартасцей мастацкага твора – высокую сучаснасць; арыгінальнасць і свежасць тэмы, ідэі; выразную, сціслую, зразумелую мову; прыгажосць; любоў да сваёй радзімы ; займальны сюжэт. Да гэтых шасці можна дадаць сёмую вартасць. Гэта наяўнасць у творы мастацкіх сродкаў, асабліва вобразаў-сімвалаў. Бо сімвалы - гэта аспект творчасці, якога дасягаюць і да якога звяртаюцца толькі тыя пісьменнікі, у якіх ёсць вялікая здольнасць адчуваць свае творы і якія маюць рознабаковае творчае мысленне. Без гэтага ўявіць асобную з’яву ці прадмет і адлюстраваць яго ў сімвале немагчыма.

Трэба падкрэсліць уменне Караткевіча выкарыстоўваць адметныя прыёмы для вырашэння канкрэтнай літаратурнай задачы. У “Пароме на бурнай рацэ” – стварэнне атмасферы праз апісанні прыроды, у “Каласах пад сярпом тваім” – праз захапленне характарамі беларусаў, у “Сівой леген-

дзе" – праз рамантычную ўзнёсласць. "Зямля пад белымі крыламі" – гэта своеасаблівая мастацкая энцыклапедыя Беларусі. Што робіць гэтыя творы адметнымі? Тое, што Уладзімір Караткевіч памайстэрску выкарыстоўваў сімвалы, гэтым самым даючы чытачам аснову для філасофскіх разважанняў, дыскусій. Ужо на самым пачатку, напрыклад, той жа "Зямлі пад белымі крыламі" Караткевіч з лагоднай усмешкай піша: "Да пэўнай ступені бусел – сімвал Беларусі. Ёсць, вядома, дацкія буслы, апетыя Андэрсенам, ёсць буслы і ў іншых заходніх краінах. Ёсць яны і на поўдні. Але на ўсход ад Беларусі, калі не лічыць Сярэднюю Азію, яны ўжо амаль не водзяцца. Так што нават цікава, а хто там прыносіць у дом дзяцей". Не аднымі бусламі багатая Беларусь. У іншых творах Уладзіміра Караткевіча дастаткова вобразаў-сімвалаў. Асобна трэба вылучыць сімвалы радзімы (каласы, жаўрукі, шыпшына, лебедзь, вада і інш.)

Асабліва глыбока Уладзімір Караткевіч выказвае свае думкі, разважае над сэнсам чалавечага жыцця і лёсам роднага краю ў аповесці "Ладдзя Роспачы". Ён выказвае свае погляды і выступае ў ролі назіральніка за паводзінамі галоўнага героя, беларуса Гервасія Вылівахі. Галоўны герой – "небагаты, але добрага роду дваранін па прозвішчу Гервасій Выліваха". Як вызначае ў творы сам пісьменнік, Выліваха быў "хобаль, залётнік, піяка, задзіра, біток, бабздыр несамавіты". Але аўтар заўважае і тое, што галоўны герой вызначаўся знешняй прыгажосцю, пяшчотнасцю, меў шмат сяброў. Уладзімір Караткевіч намаляваў вобраз далёка не ідэальнага чалавека, хутчэй наадварот, хоць дакладна сваіх аўтарскіх сімпатый ці антыпатый не выказаў. Аўтар паказвае жыццёвую праўду – ідэальных людзей не бывае.

Падчас сустрэчы са Смерцю галоўны герой паводзіў сябе надзіва стрымана і нават гасцінна. Выліваха паслухмяна падпарадкаваўся яе загаду, бо добра ведаў, што ад Смерці яшчэ ніхто не схаваўся і не адкупіўся: "І вышэй за гэтую жанчыну не было нікога на зямлі". Па дарозе ў апраметную Гервасій сарваў і прышпіліў да сваіх грудзей першую кветку шыпшыны – сімвал роднай зямлі. Чаму менавіта шыпшына – зразумела. Нягледзячы на тое, што Беларусь у тыя часы перажывала не лепшыя часы свайго існавання і ёй трэба было адрасціць шыпы, каб зусім не зламалі, яна засталася такой жа маладой, квітнеючай і прыгожай. Аддаць кветку Смерці – значыць страціць радзіму, стаць бяспамятным. І вось ён, Выліваха, які трыццаць тры гады пражыў на гэтым свеце, ідзе побач са Смерцю, разумеючы, што яго час выходзіць. У гэтым эпізодзе можна звярнуць увагу на яшчэ два адметныя сімвалы. Вадапад (вада) і Ладдзя. На прыкладзе Перавозчыка (Шолаха) Караткевіч выкрывае ганебную з'яву здрадніцтва. Герой з болем прызнаецца прысутным на ладдзі ў сваёй здрадзе: прадаў Полацк кіеўскаму князю Уладзіміру. Слёзы, якія з'явіліся на вачах Шолаха пасля песні Вылівахі, сведчаць пра духоўнае ачышчэнне палачаніна. Вада заўсёды лічылася у людзей сімвалам ачышчэння, але адначасова вялікай бяды. Таму Выліваха адправіўся ў царства Смерці праз ваду і большасць наступных падзей адбываюцца ў Ладдзі на вадзе.

Гульня са Смерцю ў шахматы з'яўляецца кульмінацыйным момантам твора. Уладарка пекла з усіх весляроў выбрала для гульні менавіта Гервасія, таму што ён неардынарная асоба. Шахматы – гульня для знаходлівых і разумных, у ёй ёсць белае і чорнае, што таксама дастаткова адметны сімвал барацьбы дабра са злом. Не спадабаліся Смерці яго прага да жыцця, бунтарства, нязломнасць духу і аптымізм. Сваёй загадзя прадбачанай перамогай кашчавая разлічвала знішчыць Выліваху маральна, прадэманстраваць усім прысутным яго нікчэмнасць перад ёю. Хоць шляхціц і прайграў першую партыю, але прынізіць яго чалавечы гонар гаспадыні апраметнай усё роўна не ўдалося. Героем кіравалі мудрасць і любоў да роднай зямлі. Апроч сімвалічнага вобраза кветкі шыпшыны, Уладзімір Караткевіч тройчы паказвае ў аповесці і вобраз беларускіх жаўрукоў - прадвеснікаў надыходу вясны, цяпла, волі і шчасця.

Асэнсаванне сімвалаў чытачамі некалькі адрозніваецца ад тлумачэння іх даследчыкамі літаратуры. Даследаванне была праведзена ва ўстанове адукацыі Полацкі каледж ВДУ імя П.М.Машэрава з дапамогай навучэнцаў групы чацвёртага курса спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя". Навучэнцам пасля паведамлення пра вобразы-сімвалы ў аповесці "Ладдзя роспачы" і іх знаёмства з творам, былі прапанаваны наступныя пытанні.

1. Што, на ваш погляд, сімвалізуюць васілёк? Жыта? Жаўрук? Лебедзь? Вада? Ладдзя? Шахматы? Шыпшына?

2. Як вы лічыце, якую ролю адыгрываюць вобразы-сімвалы ў творах Уладзіміра Караткевіча?

3. На вашу думку, ці мог аўтар зусім іх не выкарыстоўваць?

4. Вы ад'язджаеце жыць ў іншую краіну на вялікі прамежак часу або назаўсёды. Што вы возьмеце з сабой як сімвал роднага краю?



Рэпазіторый ВДУ

Сімвалы навучэнцы растлумачылі так: **васілёк** – радзіма, сям'я, блакітнае неба, прыгажосць, маладосць, дом, чысціня, паветра, сімвал Славянскага Базара; **жыта** – хлеб, дастатак, раніца ў вёсцы, краіна, чалавечы хлеб, багацце, лета, здароўе, летняя раніца; **жаўрук** – вясна, прадвеснік вясны, свабода, палёт, пакорнасць, радзіма, свабода, незалежнасць; **лебедзь –** бясконцае каханне, прыгажосць, спакой, вернасць, пара, жанчына, чысціня, вытанчанасць; **вада** – чысціня, жыццё, маладосць, свежасць, прастата, дапамога; **ладдзя** – далёкі шлях, падарожжа, супакаенне, памяць, барацьба, змены ў жыцці, спакой; **шахматы –** барацьба дабра і зла, розум, логіка, перамога, адпачынак, вольны час, азарт, гульня, інтэлект, зацікаўленасць; **шыпшына** – радзіма, родная зямля, прыгажосць, здароўе.

На другое пытанне былі выказаны наступныя меркаванні:
сімвалы робяць твор больш цікавым, прымушаюць разважаць;дапамагаюць лепш зразумець маштабнасць аўтарскай задумы, унутраны свет дзеючых асоб; узбагачаюць мову; праз сімвалы раскрываюцца асаблівасці характару людзей. На трэцяе пытанне навучэнцы адказалі так: мог не выкарыстаць – 25% (замяніць, казаць прама), нельга не выкарыстоўваць – 75% (мог, але не было б так цікава, патрыятычна). З сабой у іншую краіну навчэнцы ўзялі б зборнік вершаў беларускіх пісьменнікаў, фотаздымкі прыроды, засушаны васілёк, кляновы лісток, фотаздымак бацькоў, значкі з беларускім арнаментам, ноты "Гімна Беларусі", маленькі сцяг Беларусі, майку з нацыянальным арнаментам, лялькy ў беларускім адзенні.

**Заключэнне.** Нашым невялікім даследаваннем пацверджаецца думка пра тое, што сімвалы маюць некалькі значэнняў. Як літаратурныя крытыкі, так і чытачы, маюць свой погляд на тлумачэнне таго ці іншага сімвала. Шмат агульнага выявілася пры тлумачэнні сімвалаў, што паказваюць радзіму. Па-рознаму навучэнцы і крытыкі ўспрымаюць філасофскія сімвалы, напяцці "вада", "ладдзя", "шахматы", "лебедзь", "жаўрук". Як даследчыкі літаратуры, так і большасць навучэнцаў лічаць, што вобразы-сімвалы ўзбагачаюць твор, робяць яго больш цікавым, дапамагаюць лепш зразумець маштабнасць аўтарскай задумы, унутраны свет дзеючых асоб, раскрыць асаблівасці беларускага характару, роднай зямлі. Большасць навучэнцаў згодны з літаратуразнаўцамі, сцвярджаючы, што творы Караткевіча страцілі б вельмі многа без вобразаў-сімвалаў. Адказы на апошняе пытанне паказалі, што сімваламі радзімы для нашых навучэнцаў з'яўляюцца самыя звычайныя рэчы: фотаздымкі прыроды, бацькоў, зборнік вершаў беларускіх пісьменнікаў, расліны (васілёк, кляновы лісток). Для некаторых жа сімвалізуюць Беларусь нацыянальны арнамент, адзенне. Былі названыя і галоўныя сімвалы нашай краіны – сцяг, герб, гімн.

Творы Уладзіміра Караткевіча – сапраўдныя дыяменты беларускай літаратуры. Колькі б ні вывучаў яго творчасць, кожны раз будзеш знаходзіць усё больш загадак, якія патрабуюць адгадкі, глыбокага асэнсавання.


1. Верабей, А. Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творч. У. Караткевіча. – Мн.: Маст. літ., 1997. – 256 с.
2. Мальдзіс, А. Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партр. пісьменніка і чалавека. – Мн.: Маст. літ., 1990. – 230 с.
3. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літ. творчасці. – Мн.: Маст. літ., 2000. – 300 с.


## АНТРОПОЭТОНИМЫ В ТРИЛОГИИ РОМАНОВ-СКАЗОК Н.Н. НОСОВА О НЕЗНАЙКЕ


***Андручёнок А.С.,***
*студентка 3 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Глазман Л.Я., канд. филол. наук*


Исследования ономастического пространства детской литературы немногочисленны. На наш взгляд, имена собственные – один из важных компонентов, формирующих художественный мир. В произведениях детской литературы зачастую онимы характеризуются прозрачной мотивацией, что позволяет читателю-ребенку свободно декодировать текст и переносить в свое сознание художественный мир, созданный автором. Итак, актуальность работы мы видим в недостаточности исследований в области детской литературной ономастики.

Цель работы – исследовать антропоэтонимы романов-сказок Н. Носова о Незнайке.

**Материал и методы.** Материалом для исследования послужил текст произведений о Незнайке Н.Н. Носова. Методы исследования: анализ, сопоставление, сравнение, обобщение тезисов специальной литературы.